Справавы бару

Грамадска-адукацыйны праект



Модуль

3

# УЗРОЎНІ І ТЫПЫ ВЫБАРАЎ



5 старонак

# ДЗЯРЖАЎНЫ ЛАД

## РЭСПУБЛІКА

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ

### Супер-прэзідэнцкая

Улада прэзідэнта значна большая, чым у парламента.

### Прэзідэнцка-парламенцкая

У прэзідэнта ёсць пэўная ўлада, але і ў парламента — значныя паўнамоцтвы.

### Парламенцкая

У парламента значная ўлада, а прэзідэнт мае больш прадстаўнічыя функцыі.

## МАНАРХІЯ

### Абсалютная

Усё вырашае манарх.

### Канстутыцыйная

Улада манарха абмежаваная канстытуцыяй, ёсць парламент і ўрад.

# ПРЫНЦЫПЫ

Вельмі часта, асабліва ў маладых альбо пераходных дэмакратыях, лічыцца, што чым больш існуе магчымасцяў выбіраць законных прадстаўнікоў на розных узроўнях, тым краіна больш дэмакратычная.

Гэта не зусім так, паколькі кожная дэмакратыя спалучае разнастайныя структуры і выбарныя органы. І немагчыма толькі па аднаму гэтаму крытэрыю вызначыць ступень дэмакратычнасці асобнай дзяржавы.

# ВЫБАРЫ І ДЭМАКРАТЫЯ

Дэмакратыя — складаная комплексная сістэма стрымліваючых механізмаў і процівагаў, якія забяспечваюць незалежнасць паміж рознымі галінамі ўлады і іх аўтаномнае, але адначасова і сумеснае функцыянаванне ў дзяржаве.

У развітай дэмакратыі незалежныя паміж сабой інстытуты працуюць эфектыўна без неабходнасці абірацца кожнаму з іх на адпаведных узроўнях.

## БЕЗ ВЫБАРАЎ ДЭМАКРАТЫІ БЫЦЬ НЕ МОЖА

Для разумення сутнасці дэмакратыі і ролі выбараў у ёй варта звярнуцца да вядомага рэйтынгу Freedom House, які для ацэнкі дэмакратычнасці краіны выкарыстоўвае наступныя паказальнікі:

- Выбарчы працэс
- Палітычны плюралізм і магчымасць удзелу ў палітычных працэсах у краіне
- Асабістая аўтаномія і індывідуальныя правы
- Свабода выказвання і веры
- Функцыянаванне ўрада
- Свабода асацыяцый і аб’яднанняў
- Вяршэнства права

Як бачна, выбарчы працэс адыгрывае вельмі важную ролю, але толькі ў сукупнасці з іншымі рысамі дэмакратыі ён можна выконваць сваю функцыю цалкам.

# СІСТЭМЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ

Тып выбараў у вялікай ступені залежыць ад сістэмы дзяржаўнага кіравання канкрэтнай краіны.

Большасць дзяржаў дзеліцца на манархіі і рэспублікі.

## МАНАРХІІ

У манархіях кіруе дзяржавай кароль ці каралева, а ў канстытуцыйных манархіях найбольшую рэальную ўладу мае прэм'ер-міністр / прэм'ер-міністарка, які / якая найчасцей з'яўляецца лідарам партыі, што выйграла парламенцкія выбары.

У такіх краінах парламенцкія выбары — самае важнае палітычнае мерапрыемства.

## РЭСПУБЛІКІ

Рэспублікі бываюць прэзідэнцкія, парламенцкія і змешаныя, прэзідэнцка-парламенцкія.

Напрыклад, у Латвіі, што з'яўляецца парламенцкай рэспублікай, прэзідэнта абірае парламент, а сам парламент праз наўпроставыя выбары абіраюць грамадзяне, якія маюць на гэта права.

У прэзідэнцка-парламенцкіх рэспубліках, такіх як Польшча, і выбары ў парламент, і выбары прэзідэнта адбываюцца з удзелам усіх, хто валодае правам голасу.

Па сваёй важнасці гэтыя выбары будуць мець падобнае значэнне. І ўжо ў кожнай асобнай краіне ад канстытуцыі і дадатковага заканадаўства залежыць, хто будзе мець рэальную ўладу — прэзідэнт ці прэм'ер-міністр / прэм'ер-міністарка.

Часамі ўлада прэзідэнта настолькі моцна пераважвае ўладу парламента, што рэспублікі называюць прэзідэнцкімі ці нават суперпрэзідэнцкімі.

Пры гэтым не абавязкова адносна вялікая ўлада прэзідэнта сведчыць аб адсутнасці дэмакратыі. Але рэальная ўлада парламента — вельмі істотны элемент дэмакратыі.

# МЯСЦОВЫЯ ВЫБАРЫ

Мясцовыя выбары ўяўляюць сабой працэс выбару мясцовых органаў улады. У залежнасці ад краіны гэта могуць быць мэры, кіраўнікі абласных ці раённых адміністрацый, а таксама прадстаўнікі мясцовых заканадаўчых органаў.

Мясцовыя выбары могуць адыгрываць важную ролю ў краінах з кампактна пражываючымі нацыянальнымі меншасцямі, дзе выбраныя прадстаўнікі этнічных і нацыянальных групаў могуць непасрэдна ўплываць на прыняцце рашэнняў і ажыццяўляць заканадаўчыя ініцыятывы на тэрыторыях, дзе яны жывуць.

На працягу гадоў пры ўладзе яны часамі акумулююць сувязі і значны кантроль не толькі над мясцовымі ўладамі, але таксама бізнэсам і медыямі.

З аднаго боку, дэцэнтралізацыя можа дазволіць вырашаць мясцовыя пытанні больш эфектыўна праз лепшае разуменне праблемаў людзьмі, якія добра ведаюць рэгіён ці горад, іх асаблівасці, і за кошт мясцовага бюджэту могуць ажыццяўляць усе важныя функцыі мясцовых уладаў.

Але такая сістэма можа прывесці і да занадта вялікай дэцэнтралізацыі, калі мясцовыя ўлады могуць пачаць не падпарадкоўвацца цэнтральнай уладзе, а нават ёй супрацьстаяць.

# РЭФЕРЭНДУМЫ

Рэферэндум — агульнае галасаванне, дзе жыхары адказваюць на нейкае пытанне «так» ці «не». Рэферэндумы могуць быць агульнанацыянальнымі ці мясцовымі.

Гэты інструмент наўпроставай дэмакратыі, дзякуючы якому жыхары вельмі часта вырашаюць як анульнакраінавыя, так і мясцовыя пытанні на ўзроўні адміністратыўных адзінак, карыстаецца вялікай папулярнасцю, напрыклад, ў Швейцарыі.

**ДОЎГІ ДЭМАКРАТЫЧНЫ ДОСВЕД ДАЗВАЛЯЕ З ДАПАМОГАЙ РЭФЕРЭНДУМАЎ ПРЫМАЦЬ ЭФЕКТЫЎНЫЯ РАШЭННІ**

У іншых дзяржавах, сярод якіх Беларусь, рэферэндумы маюць неадназачную рэпутацыю. Каб вырашаць праблему на рэферэндуме, грамадства ў адпаведнай краіне павінна мець высокі ўзровень палітычнай культуры, быць заангажаваным

у самыя розныя палітычныя працэсы і рашэнні. Калі гэтага няма, нават дэмакратыі з вельмі доўгай традыцыяй, такія як Велікабрытанія, могуць сутыкнуцца з моцнай палярызацыяй гарамадства і цяжкасцямі ў разуменні сутнасці пытання, якое паставілі на галасаванне, як на рэферэндуме па Брэксіту.

Акрамя таго, улады могуць карыстацца інструментамі рэферэндуму, каб у адпаведны час сфармуляваць пытанне на сваю карысць. Напрыклад, дадаць пытанне, прагаласаваць за якое ў комплексе з іншымі выбарцамі было б складана падчас звычайных выбараў.

Грамадска-адукацыйны праект «Справа выбару»
vybar.org

Спра
вавы
бару